ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *РЭЦЭНЗІІ*

*REVIEWS*

Поступила в редакцию 06.11.2018
Received 06.11.2018

https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-2-242-250

**У. В. Здановіч**

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь*

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў СВЯТЛЕ НОВЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦ

У 2011 г. у сувязі з 70-годдзем пачатку Вялікай Айчыннай вайны сумеснымі намаганнямі гісторыкаў Расіі, Беларусі і Украіны пачалася рэалізацыя праекта “Краіна ў агні”, вынікам якога з’явілася фундаментальнае трохтомнае выданне “Страна в огне” (тэматычныя нарысы і зборнікі дакументаў). Праца над праектам мае свае асаблівасці. Першы том “1941 год : Страна в огне” быў выдадзены ў 2011 г. Другі “Страна в огне: Коренной перелом. 1942–1943” і трэці “Страна в огне: в 3 т. Освобождение. 1944–1945” тамы ўбачылі свет толькі ў 2017 г. Такая затрымка ў значнай ступені выклікана сітуацыяй ва Украіне. Падзеі, якія адбыліся там, не толькі затрымалі выхад выдання, але і паўплывалі на склад аўтарскага калектыву, а таксама на структуру чарговага двухтомніка. Распачатую трохбаковую працу расійскіх, беларускіх і ўкраінскіх навукоўцаў працягнулі гісторыкі дзвюх дзяржаў – Расіі і Беларусі.

У першай кнізе, якая складаецца з трох частак – “Расія”, “Беларусь”, “Украіна”, змешчаны нарысы, падрыхтаваныя адпаведна супрацоўнікамі Акадэмій навук Расіі, Украіны і Беларусі, прысвечаныя падзеям першага года Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі адзначаных краін **(1941 год : Страна в огне: в 2 кн. – М .: ОЛМА Медиа Групп, 2011. – Кн. 1. – Очерки. – 720 с.)**. 3 ліпеня 2009 г. Парламенцкай асамблеяй АБСЕ была прынята рэзалюцыя, у якой у развязванні Другой сусветнай вайны абвінавачаны разам з Германіяй і Савецкі Саюз. У гэтай сувязі апраўданым і мэтазгодным з’яўляецца ўключэнне ў расійскую частку раздзела, у якім раскрываюцца змены на міжнароднай арэне напярэдадні вайны, матэрыялаў па падрыхтоўцы Германіі і яе саюзнікаў да нападу на СССР. Рассакрэчаныя ў Расіі ў 1990 – 2000-я гг. дакументы Міністэрства замежных спраў і Міністэрства абароны пацвярджаюць, што, “нягледзячы на пралікі і памылкі, савецкая знешняя палітыка з часу прыходу Гітлера да ўлады і да нападу Германіі на СССР была накіравана на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі, саюза дзяржаў і народаў для барацьбы з фашысцкай агрэсіяй. У той жа час дакументы бясспрэчна паказваюць (як і раней апублікаваны “Архіў Дзірксена”), што мэтай заходніх дэмакратый было не толькі пазбегнуць уключэння ў вайну, але і, спрыяючы ўзбраенню Германіі, накіраваць зарад яе агрэсіі супраць СССР” (с. 27).

У сваю чаргу ўкраінскія гісторыкі ўключылі ў сваю частку раздзел, прысвечаны “ўкраінскаму пытанню”, маючы на ўвазе “дзяржаўную прыналежнасць украінскіх этнічных тэрыторый, якія ахоплівалі ўласна УССР, а таксама Букавіну, Закарпацце, Валынь, Усходнюю Галіцыю, Лемкаўшчыну, Падляшша, Холмшчыну, Надсанне” (с. 541). Асноўную ўвагу аўтары засяродзілі на палітыцы Германіі і СССР. Так, аналізуючы планы Гітлера, яны адзначаюць, што “на справе Гітлер нікому не збіраўся даваць гарантый дзяржаўнасці ... Украіна цікавіла яго ў якасці невы-

© Здановіч У. В., 2019

чэрпнага рэзервуара сыравіны, прадуктаў харчавання і працоўнай сілы, і далей гэтага думкі фюрэра не ішлі" (с. 543). І. В. Сталін, "чаргуючы гнуткае манеўраванне, саступкі (у якасці прыкладу можа служыць палітыка "ўкраінізацыі") і жорсткія рэпрэсіі, яшчэ ў 1930-я гг. імкнуўся нейтралізаваць перадумовы для эскалацыі "ўкраінскага сепаратызму" (с. 545).

Як вядома, пачатковы перыяд аказаўся трагічным для Чырвонай Арміі. Аўтары трохтомніка адказваюць на пытанне аб тым, чаму краіна ўлетку 1941 г. апынулася на мяжы катастрофы. Так, расійскія гісторыкі вылучаюць аб'ектыўныя (колькасная перавага праціўніка, раптоўнасць нападу ворага, недастатковая ступень забяспечанасці сродкамі СПА, адсутнасць у фронту рэзерваў, запозненае заняцце рубяжоў УРаў, адсутнасць прыкрыцця з паветра) і суб'ектыўныя прычыны (неарганізаванасць і бестурботнасць многіх камандзіраў, у тым ліку вялікіх начальнікаў, расхаладжанасць многіх звенняў акруговага і армейскага ўпраўленняў, адсутнасць цвярозай ацэнкі праціўніка, яго магчымасцей, псіхалагічная негатоўнасць войскаў да нападу праціўніка) (с. 86, 87, 92, 93).

Аналізуючы прычыны няўдач Чырвонай Арміі ў першыя тыдні вайны, беларускія даследчыкі асноўны ўхіл зрабілі на суб'ектыўны фактар, падкрэсліўшы, што прычыны " заключаюцца перш за ўсё ў праліках ваенна-палітычнага кіраўніцтва ў поглядах на пачатковы перыяд вайны і мерапрыемствы па падрыхтоўцы краіны і яе ўзброеных сіл да верагоднай агрэсіі … штабы акругі і армій па ўзроўні сваёй падрыхтоўкі да ўпраўлення войскамі, аб'яднаннямі і злучэннямі аказаліся к пачатку Вялікай Айчыннай вайны недастаткова падрыхтаванымі… Тэатр ваенных дзеянняў, на якім давялося змагацца войскам Заходняга фронту, у тым ліку і 4-й арміі, к пачатку вайны аказаўся непадрыхтаваным" (с. 272, 292, 401).

Аднак, нягледзячы на ўсе абставіны аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характару, уражлівыя першапачатковыя поспехі вермахта, вайна для Гітлера развівалася не па сцэнарыі, прадугледжаным планам "Барбароса". "У неверагодна цяжкіх умовах, – пішуць беларускія даследчыкі, – савецкім войскам сваім гераічным супраціўленнем удалося закласці першы камень у падмурак будучай перамогі над моцным і шматвопытным ворагам" (с. 402).

Перамогай Савецкага Саюза закончылася бітва за Маскву. "Нямецкія войскі зімой 1942–1943 г., – адзначаюць расійскія гісторыкі, – сталі губляць веру ў свае сілы, а савецкія салдаты і іх камандзіры, наадварот, набылі ўпэўненасць у перамозе над ворагам" (с. 190).

Высновы расійскіх і беларускіх калег падтрымалі ўкраінскія гісторыкі, якія, адзначаючы трагізм падзей, значныя страты Чырвонай Арміі, у той жа час падкрэсліваюць, што "ўвесь свет пераканаўся – нямецкая армія можа цярпець паражэнні, а савецкая – іх наносіць" (с. 585).

Значны ўклад у абарону роднай зямлі на пачатковым этапе ўнеслі добраахвотніцкія фарміраванні – народнае апалчэнне, знішчальныя батальёны і групы. Выклікае цікавасць ацэнка, дадзеная ўкраінскімі гісторыкамі наконт дзейнасці дадзеных фарміраванняў, якая адрозніваецца ад ацэнак расійскіх і беларускіх аўтараў. "З аднаго боку, – падкрэсліваюць даследчыкі, – яна сведчыла пра патрыятызм, самаахвярнасць і імкненні значнай часткі грамадзянскага насельніцтва змагацца з захопнікамі, а з другога – да яе разгортвання прывялі пэўныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя абставіны (у першую чаргу непадрыхтаванасць дзяржавы і арміі да вайны, а таксама звязаныя з гэтым меры, закліканыя забяспечыць абараназдольнасць краіны)" (с. 616).

Пры аналізе падзей 1941 г. неабходна звярнуць увагу на падрыхтаваны беларускімі аўтарамі раздзел "Война и белорусское общество", у якім разглядаюцца пытанні жыццядзейнасці савецкіх уладных структур і насельніцтва Беларусі ва ўмовах пачатку вайны – практычна не даследаваныя раней сацыяльныя і псіхалагічныя аспекты. "Шырокамаштабнае ваеннае супрацьстаянне на тэрыторыі Беларусі летам 1941г., – пішуць навукоўцы, – бамбёжкі, артабстрэлы і каласальныя разбурэнні, супраціўленне, у многіх месцах сапраўды гераічнае, часцей і злучэнняў Чырвонай Арміі, іх выніковае паражэнне і адступленне, захоп акупантамі аднаго за другім рэгіёнаў рэспублікі, смерць і палон дзясяткаў і соцень тысяч людзей прынеслі на беларускую зямлю крывавы хаос, стварылі шмагранную, у многім не кіруемую сітуацыю надзвычайнай складанасці… Сярод насельніцтва акрамя патрыятычных настрояў, лаяльнасці ў адносінах да савецкай улады існавалі іншыя погляды і ўчынкі" (с. 493, 494).

Гісторыя чалавецтва паказвае, што непазбежнымі спадарожнікамі любога ўзброенага канфлікту з'яўляюцца ваеннапалонныя. Дадзеная праблема разгледжана расійскімі гісторыкамі ў трэцім раздзеле. За ўвесь перыяд вайны ў палон трапіла 4 млн 59 тыс. чалавек, у тым ліку ў 1941 г. – 2 млн. Вялікую колькасць палонных аўтары тлумачаць наступнымі прычынамі: "войскі заходніх ваенных акруг аказаліся непадрыхтаванымі да раптоўнага нападу фашысцкай Германіі ... Многія савецкія салдаты і афіцэры былі захоплены ў палон будучы цяжка параненымі і кантужанымі. Апроч таго ... нямецкае камандаванне нярэдка засылала пераапранутых дыверсантаў, якія распаўсюджвалі лжывыя чуткі, сеялі паніку ... Маральна-псіхалагічны стан многіх байцоў пахіснуўся нечаканай сілай нямецкага ўдару" (с. 233). Разам з тым, як справядліва адзначаюць даследчыкі, маральны надлом савецкіх войскаў у пачатковы перыяд вайны не насіў незваротнага характару. Лёс савецкіх ваеннапалонных адносіцца да найбольшых трагедый вайны. Прыведзеныя ў кнізе факты пацвярджаюць сутнасць нацысцкай палітыкі, накіраванай на знішчэнне савецкіх ваеннапалонных, у дачыненні да якіх не дзейнічалі ні нормы міжнароднага права, ні агульначалавечыя прынцыпы гуманізму.

У выніку паражэння ў Беларусі войскаў Чырвонай Арміі ў ліпені – жніўні 1941 г. тэрыторыя рэспублікі была акупавана вермахтам. "Акупацыйны рэжым, – адзначаюць беларускія аўтары, – па кіраванні захопленымі мясцовасцямі ствараўся як спантанна нямецкімі ваеннымі структурамі, так і па загадзя падрыхтаванай схеме арганізацыі грамадзянскай германскай адміністрацыі ў рэгіёнах Беларусі, з прыцягненнем дзеячаў калабарацыі. Паглыбленне ў масіў дакументальных крыніц дазваляе ... убачыць больш дакладна, аб'ёмна разгорнуты нацыстамі з першых дзён акупацыі генацыд на беларускай зямлі" (с. 447).

Матэрыял, змешчаны ў раздзеле, сведчыць, што другая палова 1941 г. стала і часам зараджэння партызанскай і падпольнай барацьбы ў Беларусі, "якая была адзначана ўжо ў 1941 г. шэрагам эфектыўных баявых удараў па ворагу. На фоне надзвычай складанай і цяжкай для савецкага боку ваеннай сітуацыі гэта натхняла партызан і падпольшчыкаў, большасць насельніцтва" (с. 445).

Станаўленне партызанскай і падпольнай барацьбы ва Украіне мае свае асаблівасці. Нароўні з дзейнасцю савецкіх партызан і падпольшчыкаў, адпавядаючай агульным намаганням краіны, якая перажывала адно з самых складаных выпрабаванняў у сваёй гісторыі, што ўрэшце дапамагло выстаяць, украінскія навукоўцы звяртаюць увагу і на арганізацыі ўкраінскіх "незалежнікаў", самай значнай сярод якіх была АУН. Характарызуючы дзейнасць "аўнаўцаў", асноўны ўхіл даследчыкі зрабілі на рэпрэсіі германскіх улад супраць іх, а не на барацьбу арганізацый АУН-УПА з вермахтам і акупантамі, не пакідаючы з-пад увагі супрацьстаянне ўкраінскіх узброеных фарміраванняў і Чырвонай Арміі. Не даюць украінскія аўтары і ацэнкі дзейнасці вайскоўцаў батальёна "Нахцігаль". У прыватнасці, у раздзеле змяшчаецца наступная інфармацыя: "Не ўдаючыся ў падрабязнасці дыскусій аб дачыненні ваеннаслужачых "Нахцігаль" да расправаў над яўрэйскім насельніцтвам і польскай інтэлігенцыяй Львова, адашлём чытача да спецыяльнай літаратуры – айчыннай і замежнай (у прыватнасці, польскай), у якой гэтыя падзеі выкладаюцца без ідэалагічных нацяжак" (с. 696).

Другі том "Страна в огне: в 3 т. Коренной перелом. 1942–1943" убачыў свет толькі ў 2017 г. і быў падрыхтваны гісторыкамі Расіі і Беларусі **(Страна в огне: в 3 т. Коренной перелом. 1942–1943: в 2 кн.; отв. ред. А. М. Литвин, Ю. А. Никифоров. – М.: Абрис, 2017.– Кн. 1. – Очерки. – 734 с.)**. Першая частка нарысаў падрыхтавана расійскімі гісторыкамі, якія асноўную ўвагу засяродзілі на баявых дзеяннях на тэрыторыі СССР у 1942–1943 гг.

Бітва пад Масквой прывяла да сур'ёзнага крызісу вермахта і шмат у чым прадвызначыла ход далейшага савецка-германскага супрацьстаяння. Разам з тым, надзеі савецкага кіраўніцтва на тое, што ў вайне адбыўся пералом і ініцыятыва цалкам перайшла да Чырвонай Арміі, не спраўдзіліся. Баявыя характарыстыкі асабістага складу Чырвонай Арміі заставаліся невысокімі: нізкая дысцыпліна, адпраўка на фронт недастаткова ці зусім непадрыхтаванага папаўнення, недахоп тэхнікі, стралковай аўтаматычнай зброі, боепрыпасаў, слабая сувязь, не заўсёды кампетэнтнае кіраўніцтва войскамі. "Усе гэтыя негатыўныя фактары ... – падкрэсліваюць даследчыкі, – сведчылі пра тое, што Чырвоная Армія ўзору вясны 1942 г. у цэлым пакуль яшчэ не ўяўляла эфектыўнай ваеннай машыны, здольнай у кароткі тэрмін разграміць вермахт" (с. 23). Пацвярджэннем дадзе-

нага вываду служыць факт паражэння савецкіх войскаў пад Ленінградам, Харкавам, у Крыме, сітуацыя з 2-й ударнай арміяй, якая апынулася адрэзанай ад асноўных сіл, немагчымасць ліквідацыі буйной нямецкай групоўкі, акружанай пад Дзямянскам. Аўтары прадстаўляюць сваё, на наш погляд, апраўданае бачанне прычын няўдач Чырвонай Арміі. Побач з аб'ектыўнымі (вялікая рухомасць нямецкага боку, якая давала перавагу ў выбары месца прарыву, масіраванае выкарыстанне ворагам авіяцыі на полі бою) гісторыкі вылучаюць і суб'ектыўныя прычыны, што было немагчыма ў савецкай гістарыяграфіі, да якіх адносяць перавагу нямецкіх военачальнікаў над савецкімі і зніжэнне баявога духу чырвонаармейцаў (с. 50).

Аналізуючы ход і вынікі Сталінградскай бітвы, сітуацыю на першым яе этапе, аўтары не абыходзяць увагай і такую складаную праблему, як выдадзены 28 ліпеня 1942 г. загад Народнага Камісара Абароны № 227, больш вядомы пад назвай "Ні кроку назад", згодна з якім мэтай навядзення парадку ў войсках, умацавання дысцыпліны і спынення здачы ў палон чырвонаармейцаў уводзіліся загараджальныя атрады, якія павінны былі расстрэльваць дэзерціраў, панікёраў і баязліўцаў, а таксама штрафныя батальёны і роты.

Дадзены загад разам з загадам Народнага камісара абароны № 270 ад 16 ліпеня 1941 г., паводле якога пакаранне распаўсюджвалася не толькі на чырвонаармейцаў, але і на іх родных і блізкіх, з канца 1980-х гг. стаў разглядацца ў савецкай, а затым і ў расійскай гістарыяграфіі як прыклад неапраўданай жорсткасці, а мерапрыемствы па ўмацаванні дысцыпліны – як "амаральныя", "цынічныя", "фашысцкія". Супраць такой трактоўкі загадаў выступілі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і прафесійныя ваенныя. Па меркаванні расійскіх даследчыкаў, "летам 1942 г. ніякія меры, якія маглі спыніць далейшае адступленне Чырвонай Арміі, ліквідаваць смяротную небяспеку краіне, не маглі лічыцца савецкім вярхоўным камандаваннем дастаткова суровымі. Да таго ж … увядзенне штрафных часцей адпавядала інтарэсам … многіх здзейсніўшых воінскія злачынствы ваеннаслужачых. Для іх альтэрнатывай знаходжання ў штрафной часці былі меры крымінальнага праследавання, надзвычай суровыя ва ўмовах ваеннага часу" (с. 59). Пагаджаючыся з расійскімі калегамі ў тым, што прыняцце загадаў, выкліканае надзвычайнымі абставінамі, мела станоўчае значэнне і дазволіла ўмацаваць дысцыпліну і стабілізаваць становішча, адначасова адзначым, што з іх з'яўленнем рэпрэсіі ў Чырвонай Арміі набылі яшчэ большыя маштабы. Камандзіры штрафных часцей набылі фактычна неабмежаваную ўладу, што нярэдка прыводзіла да злоўжыванняў, неапраўданых расстрэлаў, нягледзячы на тое, што расстрэл падначаленага не ў баявой абстаноўцы, ці за здзяйсненне злачыннага дзеяння, не прадугледжанага ў Палажэнні аб штрафных батальёнах і ротах, зацверджаным 26.09.1942 г., трактаваўся як злачыннае самаўпраўства, за якое камандзір падлягаў арышту і суду ваеннага трыбунала.

Як справядліва падкрэсліваюць расійскія гісторыкі, "Сталінградская бітва стала пераломнай бітвай Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Германскай арміі, якая знаходзілася, як здавалася, на вяршыні магутнасці, было нанесена буйное паражэнне з далёка ідучымі наступствамі. Чырвонай Арміі ўдалося перахапіць ініцыятыву і звесці да нуля ўсе поспехі нямецкіх войскаў у летняй кампаніі 1942 г. .... У цэлым аперацыі «Уран» і «Малы Сатурн» вызначылі тактыку і стратэгію, якая стала асновай поспехаў Чырвонай Арміі ў 1943–1945 гг." (с. 84).

У асобных раздзелах паказана барацьба савецкіх і нямецкіх войскаў за стратэгічныя крыніцы сыравіны, нафту і хлеб, баявыя дзеянні на заходнім кірунку і спробы прарыву блакады Ленінграда, ход і вынікі аперацый па вызваленні ад акупантаў Левабярэжнай Украіны, Данбаса, Кіева. Адзначаючы поспехі савецкіх войскаў у бітве за Каўказ, гісторыкі не пакінулі без увагі і дэпартацыю цэлых народаў Каўказа, якую даследчыкі ацэньваюць як рэпрэсіі. Асабліва несправядлівымі яны лічаць дэмабілізацыю з войску на працягу 1943–1944 гг. 157 тыс. прадстаўнікоў народаў Каўказа, многія з якіх мелі баявыя ўзнагароды, раненні, і перавод іх у разрад спецперасяленцаў.

Не далі жадаемых вынікаў 1-я Ржэўскі-Сычоўская і 2-я аперацыя (вядомая пад назвай "Марс"), праведзеныя ў лістападзе-снежні 1942 г., не былі паспяховымі і аперацыі па дэблакадзе Ленінграда ў першай палове 1942 г. Да таго ж трапіла ў акружэнне 2-я ўдарная армія. Паводле нямецкіх даных, прадстаўленых расійскімі гісторыкамі, у палоне апынулася каля 30 тыс. чырвонаармейцаў, у тым ліку і камандуючы арміяй генерал А. А. Уласаў.

Самым значным па аб'ёме з'яўляецца пяты раздзел, прысвечаны Курскай бітве, якая ў нямецкіх планах атрымала назву "Цытадэль", пацвярджаючы выснову савецкіх гісторыкаў аб тым, што "лета 1943 г. сталася пераломным у вайне на савецка-германскім фронце. З-за людскіх страт і страт у тэхніцы германская армія назаўжды страціла стратэгічную ініцыятыву і ў далейшым ўжо не змагла сабраць сілы для буйнога наступлення" (с. 263). Даследчыкі ўзгадваюць і памылкі, дапушчаныя савецкім камандаваннем падчас Курскай бітвы, і кошт праведзеных аперацый, у ходзе якіх страты Заходняга, Бранскага і Цэнтральнага франтоў склалі 429 890 чалавек, у тым ліку 112 529 – забітымі і знікшымі без вестак (с. 263).

Расійскія гісторыкі звярнулі ўвагу і на Тэгеранскую канферэнцыю, вынікі якой па-рознаму ацэньваліся і ацэньваюцца ў гістарыяграфіі. "Упершыню за час існавання антыгітлераўскай кааліцыі, – адзначаюць даследчыкі, – былі ўзгоднены планы вядзення вайны супраць Германіі і Японіі, абмеркаваны найважнейшыя праблемы пасляваеннага ўладкавання свету" (с. 326). Як бачна, дадзеная ацэнка не адрозніваецца ад ацэнак савецкай гістарыяграфіі.

У беларускай частцы нарысаў раскрыты сацыяльна-палітычныя і эканамічныя працэсы, якія адбываліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі, удзел суайчыннікаў у баявых дзеяннях у 1942–1943 гг., роля беларускага народа ў дасягненні карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне. Факты, прыведзеныя аўтарамі, служаць яшчэ адным доказам таго, што сутнасцю германскага акупацыйнага рэжыму з'яўлялася ліквідацыя грамадскага дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, зняволенне і знішчэнне насельніцтва рэспублікі. Па падліках беларускіх гісторыкаў, зробленых на падставе айчынных і нямецкіх крыніц, "агульная колькасць мясцовага насельніцтва, у рознай ступені і розных формах прыцягнутага да абавязковай прымусовай і рабскай працы на захопленай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку беларускіх остарбайтараў у рэйху, складала звыш 2 млн чалавек" (с. 398).

Асаблівае значэнне для ваюючых бакоў набыла барацьба за мясцовых жыхароў, ад падтрымкі якіх у значай ступені залежаў канчатковы вынік савецка-германскага супрацьстаяння. На пачатковым этапе вайны поспех мела нямецкая прапаганда. Гэта было абумоўлена перадваеннай палітыкай савецкага кіраўніцтва, паражэннямі Чырвонай Арміі, хуткай акупацыяй рэспублікі. Кіруючыя колы Германіі ў значнай ступені звязвалі свае планы з дзейнасцю маладзёжных саюзаў, якія павінны былі стаць важным сродкам рэалізацыі нацыянал-сацыялістычных ідэй. На акупаванай тэрыторыі рэспублікі былі створаны Саюз беларускай моладзі, Беларуская служба Айчыне, Саюз рускай моладзі, Саюз татарскай моладзі і Саюз барацьбы супраць бальшавізму. Найбольш уплывовым быў Саюз беларускай моладзі, у радах якога налічвалася 13,5 тыс. чалавек. Аднак "беларускія юнакі і дзяўчаты ў сваёй большасці не ўспрынялі нацыянал-сацыялістычную ідэалогію. Нават прапагандуемая ідэя нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі не магла стаць прыцягальнай на фоне масавых рэпрэсій ..." – адзначаюць айчынныя даследчыкі (с. 453).

Аналізуючы падпольную барацьбу ў перыяд карэннага пералому, гісторыкі на канкрэтных прыкладах даказваюць, што, "нягледзячы на бязлітасны тэрор, развязаны германскімі спецслужбамі супраць удзельнікаў патрыятычнага падполля, колькасць партыйна-камсамольскіх органаў і арганізацый пастаянна пашыралася і ўмацоўвалася, ахопліваючы сваім уплывам усё новыя, больш шырокія пласты беларускага народа ... На акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 2934 тэрытарыяльныя падпольныя камсамольскія арганізацыі, якія налічвалі ў сваіх радах 18 790 юнакоў і дзяўчат. У 335 антыфашысцкіх моладзевых арганізацыях змагалася 2705 чалавек, 48 124 камсамольцы змагаліся ў радах партызан, аб'яднаных у 2579 пярвічных арганізацыях" (с. 483). Падпольшчыкі ажыццяўлялі тэрарыстычныя акты супраць германскіх служачых і іх памочнікаў, псавалі абсталяванне, выносілі і вывозілі гатовую прадукцыю, разбуралі сродкі сувязі, знішчалі ваенную тэхніку, воінскія склады, базы, гаражы.

На новы ўзровень паднялася партызанская барацьба, якая стала важкім укладам у разгром нацысцкіх агрэсараў. Асаблівасці яе станаўлення і развіцця ў 1942–1943 гг. раскрываюцца ў 4-м і 6-м раздзелах. Факты, якія прыводзяць даследчыкі, у тым ліку і новыя архіўныя матэрыялы, з'яўляюцца яшчэ адным доказам таго, што ўзброеная барацьба супраць акупантаў па арганізаванасці, колькасці ўдзельнікаў, формах і сродках барацьбы пераўзыходзіла ўсе еўрапейскія краіны. Партызанская барацьба вялася разнастайнымі сродкамі: разгром нямецкіх гарнізонаў,

барацьба супраць карных экспедыцый, тэрор супраць прадстаўнікоў акупацыйных улад і калабарацыяністаў, вызваленне населеных пунктаў і тэрыторый, разведка на карысць Чырвонай Арміі, дэзарганізацыі чыгуначнай сеткі. З восені 1943 г. партызанскі рух набыў сапраўды ўсенародны характар. "... Да канца 1943 г., – падкрэсліваюць аўтары, – у Беларусі дзейнічала добра арганізаваная армія беларускіх партызан (партызанскі фронт) які трымаў пад сваім кантролем велізарныя тэрыторыі – партызанскія зоны, якія займалі ад 40 да 60% агульнай плошчы, што стварала для ворага сур'ёзныя цяжкасці ў манеўраванні і перагрупоўцы войскаў" (с. 522). Праведзеныя аперацыі «Рэйкавая вайна» і «Канцэрт» не маюць сабе роўных у еўрапейскай гісторыі.

Значны маральна-палітычны ўплыў на актывізацыю партызанскай барацьбы на акупаваных тэрыторыях, дапамогу Чырвонай Арміі мела ўзаемадзеянне партызан Беларусі з расійскімі і ўкраінскімі партызанамі. Як падкрэсліваюць беларускія гісторыкі, "партызанскае братэрства і ўзаемадзеянне ўзброеных фарміраванняў саюзных рэспублік памнажала сілы ў баях супраць агульнага ворага, набліжала дзень Перамогі" (с. 642).

Карэнны перапом у вайне быў дасягнуты гераізмам не толькі на фронце, але і ў тыле савецкай дзяржавы. Як падкрэсліваюць расійскія даследчыкі, "… у 1942–1943 гг. былі дасягнуты рэальныя вынікі, якія сведчылі аб тым, што ваенная эканоміка, вядучыя галіны цяжкай індустрыі і сельскай гаспадаркі сталі развівацца нарастаючымі тэмпамі" (с. 354).

Не менш значным для Перамогі быў і ўклад рабочых, калгаснікаў, служачых, дзеячаў навукі і культуры Беларусі. Пра гэта сведчыць матэрыял, які змяшчаецца ў восьмым раздзеле, аўтары якога засяродзілі ўвагу на дзейнасці эвакуіраванага насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле, якое ўнесла значны ўклад у перамогу над нацысцкай Германіяй. Размяшчэнне і ўвод у дзеянне эвакуіраваных прадпрыемстваў, якія сталі асновай для развіцця новых, неабходных галін прамысловасці, у значнай ступені спрыялі павышэнню ваенна-эканамічнага патэнцыялу СССР. Прадстаўнікі беларускага народа прынялі актыўны ўдзел у стварэнні асновы матэрыяльна-тэхнічнай перавагі над фашысцкай Германіяй, зрабілі ўнёсак у духоўнае супрацьстаянне фашызму.

Падкрэсліваючы галоўную ролю савецкага народа ў стварэнні эканамічнай асновы для карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай вайне, аўтары адзначаюць і "вайскова-эканамічную дапамогу краін-саюзнікаў СССР, якая ў асноўным, разгарнулася з восені 1942 г. і ў першую чаргу тычылася сродкаў транспарту і прадуктаў харчавання" (с. 354).

Заключны трэці том выдання, як і папярэдні, падрыхтаваны сумеснымі намаганнямі гісторыкаў Расіі і Беларусі **(Страна в огне : в 3 т. Освобождение. 1944–1945 : в 2 кн.; отв. ред. А. М. Литвин, М. Ю. Мягков; ред.-сост. Д. В. Суржик. – М.: Абрис, 2017. – Кн. 1. – Очерки. – 717 с.)**. Расійскія даследчыкі засяродзілі ўвагу на пытаннях ваеннай стратэгіі, унутранай палітыкі, вызваленчай місіі Чырвонай Арміі, узаемадзеяння СССР з саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. У сціслай форме раскрываюцца ход і вынікі асноўных аперацый, праведзеных у 1944–1945 гг.

Беларускія гісторыкі, аналізуючы ход наступлення Чырвонай Арміі ў студзені-сакавіку 1944 г., паказваюць не толькі станоўчыя вынікі, але і невыкананыя задачы, у прыватнасці, не ўдалося выйсці на рубеж Полацк – Лепель – Магілёў – р. Пціч. Асобнае месца ў раздзеле адведзена аперацыі "Баграціён", якая з'яўляецца адной з выдатных аперацый не толькі Вялікай Айчыннай, але і Другой сусветнай войнаў, узорам спалучэння стратэгіі і тактыкі. Прыведзеныя ў працы факты з'яўляюцца пераканаўчым доказам такой высновы.

У 3, 4, і 5-м раздзелах на канкрэтных прыкладах паказаны ўклад беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў вызваленне савецкіх Карэліі і Прыбалтыкі, Правабярэжнай Украіны, краін Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Заходняй Еўропы. У раздзелах грунтоўна раскрыты падрыхтоўка, ход і вынікі аперацый па вызваленні Карэліі, Эстоніі, Латвіі, Польшчы, Аўстрыі, Чэхаславакіі, Украіны, Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Венгрыі, удзел беларусаў у баях за Берлін. Так, толькі пры вызваленні народаў Паўднёва-Усходняй Еўропы стралковымі карпусамі камандавалі 10 генералаў-беларусаў, 12 беларусаў і ўраджэнцаў стаялі на чале дывізій, 35 беларусаў былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Пададзены даследчыкамі матэрыял дае падставы сцвярджаць, што прадстаўнікі беларускага народа, змагаючыся на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, унеслі значны ўклад у перамогу над нацызмам.

Гісторыкі таксама засяродзілі ўвагу і на дзейнасці партызан на заключным этапе вайны. Так, расійскія даследчыкі асноўную ўвагу звярнулі на падзеі ў Прыбалтыцы і Украіне. “Адной з асаблівасцей узброенага супрацьстаяння за лініяй фронту на тэрыторыі Прыбалтыкі і Украіны ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны, – адзначаюць расійскія вучоныя, – з’яўляецца шырокая апора нацысцкай акупацыйнай адміністрацыі на памочніках з ліку мясцовага насельніцтва” (с. 208). Характарызуючы дзейнасць АУН-УПА, Арміі Краёвай на завяршальным этапе вайны, аўтары сканцэнтравалі ўвагу на іх тэрарыстычнай, антысавецкай дзейнасці.

Сітуацыя ў Беларусі ў 1944 г. істотна адрознівалася ад папярэдняга перыяду. “Своеасаблівасць заключалася ў тым, – адзначаюць аўтары, – што агульная абстаноўка для партызан, падпольшчыкаў і насельніцтва Беларусі ў 1944 г. значна змянілася ў горшы бок: ім даводзілася дзейнічаць і выжываць у больш неспрыяльных умовах, чым у 1943 г. Тэрыторыя, якая знаходзіцца пад акупацыяй, скарацілася, што прывяло да значнага павелічэння шчыльнасці варожых і ахоўных варожых войскаў” (с. 359). Аднак і ў такой складанай сітуацыі партызаны Беларусі выканалі задачу і “выратавалі сотні тысяч мірных грамадзян ад знішчэння гітлераўцамі і ўгону іх на фашысцкую катаргу. Патрыёты ў значнай ступені сарвалі таксама і даўно складзены план татальнага рабавання Беларусі і правядзення ў жыццё палітыкі “выпаленай зямлі” (с. 387).

Асобныя раздзелы прысвечаны савецкаму тылу на заключным этапе вайны. Расійскія даследчыкі, падкрэсліваючы, што ў супрацьстаянні з Германіяй савецкая эканоміка засноўвалася, перш за ўсё, на свае сілы, адзначаюць ваенна-эканамічную дапамогу саюзнікаў у рамках ленд-ліза. Саюзнікі пастаўлялі ўзбраенне, у тым ліку танкі і самалёты, прамысловае абсталяванне, металы, у першую чаргу каляровыя і інш. Асаблівае значэнне мела пастаўка харчавання. Савецкая вёска, аслабленая ў матэрыяльных і людскіх рэсурсах, не магла ў поўнай меры забяспечыць армію і прамысловасць прадуктамі харчавання. Даючы высокую ацэнку пастаўкам саюзнікамі прадуктаў харчавання ў СССР, аўтары ў той жа час адзначаюць: “Вялікую перамогу над фашызмам у першую чаргу забяспечылі Чырвоная Армія і працаўнікі савецкага тылу, усе тыя, хто каваў меч Перамогі і хто гэтым мячом паламаў найвялікшае зло ХХ ст.” (с. 177).

Працоўны подзвіг беларусаў на вызваленай тэрыторыі Беларусі раскрыты ў шостым раздзеле. Аналізуючы працэс аднаўлення, гісторыкі адзначаюць вялікую дапамогу, якую аказалі саюзныя рэспублікі : “станкі, абсталяванне, металы, іншыя матэрыялы былі дастаўлены ў Беларусь з Горкаўскай, Яраслаўскай, Новасібірскай, Кемераўскай, Свярдлоўскай, Кіраўскай абласцей, Удмурцкай і Татарскай АССР, Туркменскай ССР” (с. 618). У аднаўленні народнай гаспадаркі Беларусі пэўную ролю адыгралі трафейныя – рэпарацыйныя пастаўкі, якія ажыццяўляліся з мая 1945 г. па 1 студзеня 1948 г. і адбываліся найбольш інтэнсіўна ў 1945 г.

На вызваленых тэрыторыях “да людзей вярнуліся аптымізм, вера ў перамогу і надзея на будучы мір, што было абумоўлена перамогамі Чырвонай Арміі на ўсіх участках фронту, вызваленнем раней акупаваных тэрыторый Савецкага Саюза, удзелам саюзнікаў у сумеснай барацьбе з Германіяй, поспехамі ў аднаўленні народнай гаспадаркі (с. 196). Адначасова ў Прыбалтыцы, Заходняй Украіне ўзмацніліся антысавецкія настроі. Не ўсе сустракалі Чырвоную Армію з удзячнасцю на вызваленых ад нацызму краінах. Некаторыя стралялі ў спіны савецкім салдатам. Такім чынам, тыя, хто змагаўся свядома ці не супраць вызваліцелей, выступалі на баку сваіх прыгнятальнікаў.

Напружанай і нестабільнай была грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі, асабліва ў заходніх абласцях. Неадназначнымі таксама былі адносіны мясцовага насельніцтва да антысавецкіх ваенізаваных фарміраванняў. У некаторых рэгіёнах Заходняй Беларусі сяляне дапамагалі атрадам АК і УПА. Разам з тым дакументальныя крыніцы фіксуюць і дапамогу мясцовага насельніцтва органам НКУС у барацьбе з антысавецкімі сіламі. Супрацьстаянне на землях Беларусі прыводзіла да чалавечых ахвяр. “За 1945 г. у раёнах ваенна-баявых дзеянняў унутраных войскаў Беларускай ваеннай акругі, – адзначаюць беларускія гісторыкі, – было зафіксавана 189 бандпраяў, 3 дыверсійныя акты, 13 падпалаў і 41 рабаванне, у выніку якіх загінулі 138 і былі паранены 25 чалавек савецкага і партыйнага актыву, ваеннаслужачых унутраных войскаў і мясцовага насельніцтва” (с. 650).

Значна больш увагі нададзена пытанням міжнароднай абстаноўкі, характару вайны з Германіяй, вызваленчай місіі Чырвонай Арміі. “... Другая сусветная вайна, – падкрэсліваюць расійскія

даследчыкі, – мела характар у вядомым сэнсе традыцыйны, вызначаны барацьбой за еўрапейскую гегемонію ... Стаўшы ахвярай несправакаванага нападу, Савецкі Саюз пачаў справядлівую, вызваленчую вайну, якая назаўсёды засталася ў гісторыі як Вялікая Айчынная. Падзеі на савецка-германскім фронце ў 1941–1945 гг. мелі вызначальнае значэнне на ход і зыход Другой сусветнай вайны ў цэлым" (с. 15, 37).

Раскрываючы ўзаемаадносіны краін антыгітлераўскай кааліцыі, працэс станаўлення і развіцця Ялцінска-Патсдамскай сістэмы міжнародных адносін, расійскія даследчыкі пішуць, што «нягледзячы на радасць ад сумесных перамог, антыгітлераўская кааліцыя была саюзам дзяржаў з супярэчлівымі геапалітычнымі мэтамі. Іх аб'яднанне было магчыма толькі пры наяўнасці моцнага агульнага ворага. Калі ж ён пачаў слабець, старыя супярэчнасці зноў выступалі на першы план, таму сакрэтнасць праекта "Цьюб Алойз", сепаратныя перагаворы ў Берне і аперацыя "Немагчымае" – звёны аднаго ланцуга, гэта вынік геапалітычных супярэчнасцей унутры "вялікай тройкі". Аднак трэба аддаць належнае палітычнай мудрасці яе лідараў. У іх хапіла волі на тое, каб спыніцца на мяжы новай гарачай вайны і стварыць новую, Ялцінска-Патсдамскую сістэму міжнародных адносін, якая ў асноўных сваіх рысах працягвае дзейнічаць да гэтага часу. У гэтым – урок для сучаснасці, новай пагрозай якой стаў міжнародны тэрарызм» (с. 12).

Аўтарамі паказана вялікая праца, якую праводзілі і праводзяць дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі Беларусі і Расіі па захаванню памяці пра гераічныя і трагічныя старонкі мінулай вайны. Як падкрэсліваюць расійскія даследчыкі, "ахова гістарычнай памяці пра вайну прызнаецца як адзін з прыярытэтных напрамкаў унутры- і знешнепалітычнай дзейнасці", што выклікае "негатыўную рэакцыю ў адказ з боку сіл, не зацікаўленых у яе захаванні ў цяперашнім выглядзе" (с. 343). Праводзімыя ў Расіі мерапрыемствы спрыялі таму, што «рознага роду "чорныя міфы", якія паліліся ў грамадскую прастору ў эпоху крызісу і распаду Савецкага Саюза, не замацаваліся ў гістарычнай свядомасці большасці расійскіх грамадзян» (с. 344).

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну з'яўляецца неад'емнай часткай калектыўнай памяці беларускага грамадства, што абумоўлена значнасцю дадзенага перыяду ў гісторыі Беларусі. Праца па мемарыялізацыі трагічных і гераічных старонак Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца часткай дзяржаўнай палітыкі. Памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны ўвасоблена ў розных формах у літаратуры, кінематографе, музычных творах, выяўленчым мастацтве, музеях і тэматычных экспазіцыях. Імёны герояў прысвойваюцца населеным пунктам, вуліцам і плошчам, установам, прадпрыемствам, арганізацыям, навучальным установам, воінскім часцям. Па падліках даследчыкаў, на беларускай зямлі налічваецца звыш 8,8 тыс. мемарыяльных комплексаў, помнікаў, курганоў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. "Увекавечанне памяці тых, – падкрэсліваюць аўтары, – хто ў суровыя саракавыя сваёй ратнай працай адстойваў свабоду і незалежнасць Радзімы, – гэта не толькі задача гісторыкаў, палітыкаў, але і грамадская неабходнасць. Гераічныя старонкі ваеннай гісторыі – гэта тое, што дазваляе ўмацоўваць звязваючую нітку пакаленняў, гэта найбагацейшы матэрыял патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення" (с. 681).

Другая кніга кожнага тома ўяўляе сабой зборнік дакументаў і матэрыялаў, у які ўвайшлі як апублікаваныя дакументы з фундаментальных прац, так і новыя, раней недаступныя даследчыкам архіўныя матэрыялы, выяўленыя ў Расійскім дзяржаўным ваенным архіве, Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі, Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі, рэгіянальных архівах Расійскай Федэрацыі, Федэральным ваенным архіве Германіі ў Фрайбургу, Федэральным архіве Германіі ў Берліне, Прэзідэнцкай бібліятэцы Франкліна Рузвельта, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Архіве Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Латвійскім дзяржаўным гістарычным архіве, фондах цэнтральных дзяржаўных архіваў Украіны, галіновых архівах службы бяспекі і Міністэрства ўнутраных спраў Украіны, зборніках матэрыялаў, выдадзеных у Расіі, Беларусі, Украіне. Каштоўны дакументальны матэрыял запазычаны з гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць", заснаваных на матэрыялах абласных і занальных архіваў Рэспублікі Беларусь.

У другую кнігу двухтомніка "1941 год : Страна в огне" уключаны дакументы, якія адлюстроўваюць ход ваенных дзеянняў на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 г. і арганізацыю

ўсенароднага адпору захопнікам. Усяго ў зборніку, які падзелены, як і першая кніга, на тры часткі, налічваецца 383 дакументы, у тым ліку: расійскіх – 134, беларускіх – 127, украінскіх – 122.

Другая кніга другога тома выдання, якая раскрывае падзеі 1942–1943 гг., налічвае 275 дакументаў: 185 дакументаў, прадстаўленых расійскімі аўтарамі, і 90 – беларускімі.

Зборнік дакументаў і матэрыялаў, які адлюстроўвае асноўныя падзеі і ключавыя моманты завяршальнага перыяду Вялікай Айчыннай вайны, налічвае 165 і 125 дакументаў, выяўленых адпаведна расійскімі і беларускімі даследчыкамі.

Падрыхтаваныя гісторыкамі зборнікі ўключаюць Пастановы СНК СССР і БССР, ЦК УКП, ЦК КП(б)Б, загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, Дырэктывы Чырвонай Арміі, распараджэнні, дакладныя і тлумачальныя запіскі, лісты Ваенных саветаў франтоў, загады, спецпаведамленні, рашэнні міжнародных канферэнцый, радыё- і аператыўныя зводкі, шыфратэлеграмы, данясенні, перагаворы, дзённікі баявых дзеянняў нямецкіх фарміраванняў і інш. Дакументы дапоўнены ўспамінамі і сведчаннямі, што дазволіла паказаць не толькі гераічныя і трагічныя старонкі вайны, але і асаблівасці развіцця ваенна-палітычных падзей 1941–1945 гг. з найбольшай дакладнасцю. Разам з тым гісторыкі не выкарысталі ў поўным аб’ёме нямецкія дакументы, у тым ліку і апублікаваныя ў Расіі і Беларусі. У першую чаргу гэта тычыцца дакументальных зборнікаў, прысвечаных пачатковаму перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Большая частка дакументаў публікуецца ў поўным аб’ёме. Размешчаныя ў храналагічным парадку, у асноўным па часе падзей, дакументы змяшчаюць рэдакцыйны загаловак, у якім указваюцца яго разнавіднасць, аўтар, адрасат, кароткі змест і дата напісання. Кожны дакумент мае легенду, якая змешчана пад тэкстам дакумента і ўключае пошукавыя даныя дакумента (назва архіва, нумары фонду, справы і лістоў на нямецкай мове). У форме канцавых спасылак даюцца тэкставыя нататкі і каментарыі.

Такім чынам, нягледзячы на выказаныя заўвагі і пажаданні, гісторыкі прадставілі ўсебаковую рэканструкцыю мінулай вайны. Аўтарскаму калектыву ўдалося выканаць свой доўг і стварыць першую на тэрыторыі СНД фундаментальную працу, у якой дадзены аргументаваныя і дакладныя адказы на многія, у тым ліку і дыскусійныя, пытанні Вялікай Айчыннай вайны. Значнасць даследавання абумоўлена не толькі яго навуковай, але і грамадска-палітычнай складанай, што асабліва важна на сучасным этапе. Дасягнутая агульнымі намаганнямі савецкіх людзей перамога над агрэсарам павінна спрыяць лепшаму ўзаемаразуменню паміж народамі. Услед за аўтарамі спадзяемся, што дадзеная праца прыцягне ўвагу шырокага кола чытачоў і будзе садзейнічаць сцвярджэнню дакладных гістарычных ведаў.

## Информация об авторе

**Зданович Владимир Васильевич** – доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой истории Беларуси, Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина (бул. Космонавтов, 21, 224016, Брест, Республика Беларусь). E-mail: zvv2003@tut.by

## Information about the author

**Uladzimir V. Zdanovich** – D. Sc. (Hist.), Professor, Head of Foreign History of Belarus. Brest State University named after A. S. Pushkin (21 Kosmonavtov Ave., Brest 224016, Belarus). E-mail: zvv2003@tut.by